5. У чым заключаюцца перспектывы развіцця альтэрнатыўных крыніц энергіі ў краіне? 6. Якія асноўныя прычыны будаўніцтва Беларускай АЭС?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Прааналізуйце малюнак «Электрабаланс гаспадаркі Беларусі».

## § 32. Геаграфія нафтавай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці

***Узгадваем.*** *Якія віды рэсурсаў для паліўнай прамысловасці маюцца ў Беларусі?*

**Нафтавая прамысловасць.** Да асноўных відаў энергарэсурсаў свету адносіцца вуглевадародная сыравіна, перш за ўсё нафта і прыродны газ. Таму забеспячэнне энергарэсурсамі шмат у чым залежыць ад нафтавай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці. Эканоміка-геаграфічныя ўмовы развіцця нафтавай прамысловасці ў Беларусі спрыяльныя. Наяўнасць радовішчаў нафты, густая сетка шляхоў зносін, забяспечанасць воднымі рэсурсамі, блізкасць да спажыўца спрыяюць развіццю нафтавай прамысловасці. *У якой вобласці знаходзіцца асноўная здабыча нафты ў краіне?* З усіх радовішчаў па нафтаправодах яна ідзе да Рэчыцкага і Асташкавіцкага, там праходзіць прамысловую падрыхтоўку (абязводжванне, абяссольванне, сепарацыю) і падаецца ў нафтаправод «Дружба», а таксама на нафтаперапрацоўчыя заводы ў Навапалацк і Мазыр.

Краіна забяспечвае ўласнай нафтай свае патрэбы прыкладна на чвэрць. Гэтага недастаткова для функцыянавання эканомікі. З улікам склаўшыхся ўмоў увесь аб'ём спажыванай нафты Беларусь набывае ў Расіі, а ўласную здабытую нафту адпраўляе ў сырым выглядзе на экспарт у Германію. Падумайце, чаму Беларусь экспартуе здабытую нафту.

**Нафтаперапрацоўчая прамысловасць.** Нафтаперапрацоўчая прамысловасць з'яўляецца адной з найважнейшых галін прамысловасці Беларусі. Яе ўдзельная вага ў структуры апрацоўчай прамысловасці за 2010–2017 гг. складае каля 17 %. Размяшчэнне галіны ў Беларусі было звязана са спажывецкім, транспартна-інфраструктурным і ваенна-стратэгічным фактарамі (забеспячэнне палівам бранятанкавых груповак савецкіх войск у Беларускай ваеннай акрузе). Нафтапрадуктамі ў далейшым Беларусь забяспечвала рэспубліку і прылеглыя вобласці Расіі, Украіны і краін Балтыі.

Вытворчасць нафтапрадуктаў — важная крыніца валютных даходаў Беларусі. Штогод краіна экспартуе больш за палову выпрацоўваемых нафтапрадуктаў. У сярэднім за 2010–2017 гг. аб'ём экспарту нафтапрадуктаў склаў больш за 14 млн т. Асноўнымі імпарцёрамі беларускіх нафтапрадуктаў за гэты перыяд з'яўляліся Нідэрланды, Украіна і Вялікабрытанія, сумарная доля якіх перавышае 75 %.

Для нафтаперапрацоўкі пабудаваны прадпрыемства «Нафтан» у Наваполацку і Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод (мал. 122). Нафта на перапрацоўку паступае па нафтаправодзе «Дружба» (Барысаў — Унеча — Мазыр, з адгалінаваннем Унеча — Полацк і Сургут — Полацк).



Мал. 122. Прадпрыемства «Нафтан», г. Наваполацк

Пакажыце на карце атласа (с. 50) нафтаправоды, якія праходзяць праз тэрыторыю Беларусі.

Нафтаперапрацоўчыя заводы Беларусі перапрацоўваюць больш за 20 млн т нафты, з якой атрымліваюць маторнае паліва, дызельнае паліва, мазут, змазачныя маслы, дарожныя бітумы, сыравіну для нафтахімічнай прамысловасці. Мазут — паліва для цеплавых электрастанцый і кацельняў, патрэбы ў якім Беларусь забяспечвае цалкам. Рэшткі мазуту экспартуюцца ў краіны Балтыі, Украіну і Расію. Па якасці і экалагічнай чысціні маторнага паліва Беларусь лідзіруе сярод краін СНД. У 2019 г. уведзены ў эксплуатацыю першы ў краіне магістральны нафтапрадуктаправод Наваполацк — Фаніпаль.

**Газаперапрацоўчая прамысловасць.** Разам з нафтай у Гомельскай вобласці здабываецца спадарожны газ, які перапрацоўваецца на Беларускім газаперапрацоўчым заводзе ў Рэчыцы. Асноўная прадукцыя завода — сухі газ. Ён выкарыстоўваецца на Светлагорскай ЦЭЦ для спажывання насельніцтвам Рэчыцы і Светлагорска. Невялікая колькасць газу выпрацоўваецца ў Наваполацку і Мазыры. Мясцовага газу не хапае, таму ў якасці энергетычнага і бытавога паліва выкарыстоўваецца прыродны газ, які паступае па трох нітках газаправода Таржок — Мінск — Івацэвічы і газаправодзе Ямал — Еўропа. Штогадовае спажыванне газу дасягае звыш 20 млрд м$^3$. Устойліваму бесперабойнаму газазабеспячэнню краіны спрыяюць Мазырскае (Гомельская вобласць), Асіповіцкае (Магілёўская вобласць) і Прыбугскае (Брэсцкая вобласць) падземныя газасховішчы.

**Абагульнім і запомнім.** У Беларусі функцыянуюць два нафтаперапрацоўчыя заводы — у Наваполацку і Мазыры. Нафта і прыродны газ паступаюць на прадпрыемствы па трубаправодах з Расіі.

1. Назавіце фактары размяшчэння нафтавай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці Беларусі. 2. Якая сыравіна выкарыстоўваецца на нафта- і газаперапрацоўчых прадпрыемствах?

3. Чаму вытворчасць нафтапрадуктаў з'яўляецца важнай крыніцай валютных даходаў краіны? 4. З якімі праблемамі можа сутыкнуцца сучасная нафтаперапрацоўка?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Распрацуйце рэкламны плакат «Прадукцыя НПЗ Беларусі».

## § 33. Геаграфія металургіі

***Узгадваем.*** *Якія віды сыравіны неабходныя для металургічнай вытворчасці?*

**Структура і фактары размяшчэння металургічнай вытворчасці.** У структуры апрацоўчай прамысловасці Беларусі доля металургіі складае 7,4 %. Металургія адыгрывае важную ролю ў эканоміцы. Яна выпускае металы і шырокі асартымент гатовых вырабаў для прамысловасці, сельскай і лясной гаспадаркі, будаўніцтва, тавараў для народнага спажывання (мал. 123). У металургічны комплекс краіны ўваходзяць каля 20 буйных і сярэдніх прадпрыемстваў, якія вырабляюць стальныя трубы, металакорд,

**Металургія**

| Металургічная вытворчасць | Вытворчасць гатовых металічных вырабаў |
|---|---|
| чыгуну і сталі | будаўнічых металічных канструкцый і вырабаў |
| труб, трубаправодаў | радыятараў, катлоў |
| ліццё металаў | метадам парашковай металургіі |
| | іншых гатовых металічных вырабаў (тавараў народнага спажывання, малых архітэктурных формаў, вырабаў з дроту, крапежных вырабаў) |

Мал. 123. Структурная схема металургіі Беларусі